3. Курилович, Н.В. Гендерный анализ средств массовой информации: методологический аспект / Н.В. Курилович. – Минск, 2010. – 325 с.

4. Титаренко, Л.Г. Ценностный мир современного белорусского общества: гендерный аспект / Л.Г. Титаренко. – Минск : БГУ, 2004. – 254 с.

5. Ярская-Смирнова, Е.Р. Скрытый учебный план как традиция социологических исследований // Меняющаяся молодежь в меняющемся мире: невидимая повседневность / под ред. Е. Омельченко, Н. Гончаровой. – Ульяновск : Издательство Ульяновского гос. ун-та, 2006. – С. 13–21.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Грыб П.Д.,** студ. 204 гр.

Навуковы кіраўнік – Вярбіцкая В.І.

## КАТАЛІЦКАЕ СТАГОДДЗЕ ГОРАДА ОРША

Традыцыйна каталіцызм успрымаецца ў нашай культуры як рэлігія Захаду, тады як праваслаўе – гэта рэлігія, якая прыйшла на нашы землі з Усходу. Суадносна, захад нашай краіны лічыцца каталіцкім краем. І адразу ж лагічна было б выказаць здагадку аб тым, што ўсход – край праваслаўны. І сцвярджэнне гэта будзе мець рацыю. Таму зусім не дзіўна будзе пачуць аб тым, што горад Орша Віцебскай вобласці часам клічуць «горадам праваслаўным», бо там знаходзяцца жаночы і мужчынскі куцеінскія манастыры, а таксама дзейнічаюць каля дзесяці прыходаў. Даволі нечакана было даведацца, што на тэрыторыі горада, а дакладней, амаль што ў цэнтры, некалі размяшчаўся сапраўдны цэнтр каталіцтва, прадстаўлены шасцю манаскімі супольнасцямі, кожная з якіх мела свой

жылы комлпекс і святыню. Пачаўшы вывучаць дадзенае пытанне выключна з пункту гледжання цікавасці, мы сутыкнуліся з праблемай таго, што комплекснай і дакладнай інфармацыі па гэтай тэме амаль не існуе, а звесткі пра кляштары можна знайсці толькі ў двух зборніках – гэта кніга «Памяць. Орша і Аршанскі раён: гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі» [3], а таксама зборнік «Каталіцкія храмы Беларусі» Кулагіна [1]. Да таго ж звесткі гэтыя больш справачныя, энцыклапедычныя і даволі такі ўскосныя. Напрыклад, у зборніку Кулагіна на шэсць кляштарных комплексаў адведзена ўсяго толькі чатыры старонкі ды дадазена пяць фатаздымкаў. Хоця ж зразумела, што такая тэма можа быць раскрыта больш шырока і цікава. Такім чынам, было вырашана правесці ўласную даследчую работу, асноўнай мэтай якой стала б абагульненне знойдзенай ў розных крыніцах інфармацыі. Для дасягнення дадзенай мэты былі пастаўлены наступныя задачы: прааналізаваць усе даступныя крыніцы па дадзенай тэме, а таксама зрабіць уласны агляд і даследаванне захаваных кляштарных комплексаў; папрацаваць у гарадскім архіве і музеі дзеля таго, каб узбагаціць інфармацыю, якая была даступна на дадзены момант; пазнаёміцца з мінулым кляштараў, а таксама звярнуць увагу на іх сучасны лёс. У выніку асноўнай ідэяй даследавання ўвогуле стаўся аналіз так названага намі «каталіцкага стагоддзя» Оршы. А доўжылася яно з 1604 г. (канцлер Леў Сапега перадаў ордэну езуітаў кавалак зямлі каля гарадзішча) па 1772 г., калі Орша стала часткай Расійскай імперыі і новыя ўлады пачалі зачыняць каталіцкія храмы і перабудоўваць іх у праваслаўныя цэрквы і манастыры, а некаторыя проста зносіць [3]. На жаль, тое, што не паспелі разбурыць у тыя часы, паспяхова было знішчана пры канцы дваццатага стагоддзя пры Савецкай уладзе.

Калі казаць пра мінулае аршанскіх каталіцкіх кляштараў, то ў гэтае самае «каталіцкае стагоддзе», у гады росквіту, іх налічвалася шэсць, і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадстаўлены яны былі наступнымі манаскімі ордэнамі: езуіты, бернардынцы, дамінікане, трынітарыі, францішкане і базыліяне (ордэн грэка-каталіцкай царквы) [1]. Да таго ж некаторыя крыніцы сцвярджаюць, што на тэрыторыі Оршы таксама існаваў кляштар манаскага ордэну місіянераў і кляштар жаночага манаскага ордэну марыявітак, што афіцыйна выключаны з каталіцкага Касцёла і лічыцца асобным рухам. Але ж звесткі пра гэтыя два комплексы належаць некалькім інтэрнэт-рэсурсам, якія не выклікаюць даверу, таму гэтае пытанне застаецца адкрытым [2].

Адной з загадак у даследаванні стала харугва парафіяльнага аб'яднання «Рыцарства Хрыстова», звесткі пра якое вельмі цяжка знайсці, але ж гэта знаходка сведчыць пра тое, што моцным быў не толькі рух манаскі, але ж і свецкі. Сапраўды, пра парафіі нічога у вышэйпералічаных даведніках не сказана. З артыкулу Юрыя Туронка ў часопісе «Наша вера» вядома, што вернікаў-католікаў было каля палутара тысяч [4]. Харугва – адзін з нямногіх артэфактаў, які можа распавесці нам пра каталіцтва на тэрыторыі Оршы. Гэтыя нешматлікія артэфакты складаюць усяго тры палічкі ў Аршанскім этнаграфічным музеі «Млын». Астатнія артэфакты знаходзяцца ў запасніках Аршанскага музея гісторыі і культуры горада, запаснікі таксама патрабуюць даследавання і паглыблення ў іх вывучэнне.

Увогуле, кляштары былі вельмі цесна павязаны з горадам і проста не маглі не пакінуць спадчыны, акрамя будынкаў. Вядома, што калегіум езуітаў займаўся адукацыяй дзяцей шляхты і мяшчан з Оршы і прылеглых мястэчак. І тут мы кажам не толькі пра гістарычную звестку, але і пра плён гэтай справы, бо вядома, што з Аршанскага езуіцкага калегіума пачаўся духовы шлях заснавацеля ордэну дамініканаў у ЗША – Францішака Дзеружынскага [2]. Для нас яго імя нічога не кажа, але ж ён адыграў важную ролю для манаскай супольнасці. Важную ролю ў горадзе займалі і дамінікане, якія пры сваім кляштары мелі шпіталь на дзесяць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

коек. Шпіталь дзейнічаў пры бернардынскім кляштары (у захаваных жылых памяшканнях зараз знаходзіцца аддзяленне гарадской бальніцы імя Сямашка). Вышэй па вуліцы размяшчаўся кляштар францішканаў, пры якім дзейнічала багадзельня. Адносна гэтага комплексу можна сказаць, што мы маем вельмі добрыя шансы, каб рэканструіраваць яго амаль такім, якім ён быў, бо касцёл св. Антонія быў разбураны пры расшырэнні вуліцы Савецкай у 1967 г., а былы жылы комплекс захаваўся да нашых дзён і чакае рэстаўрацыі, выконваючы функцыю жылога дому [1]. Але ж кляштары і прыналежныя ім касцёлы выконвалі не толькі практычную функцыю, але і эстэтычную. Аб некаторых з іх мы можам судзіць толькі па апісанні. Напрыклад, аб касцёле трынітарыяў, які ўяўляў сабой трохнэфавую і чатырохвежавую базыліку. У 1836 г. храм быў перабудаваны ў праваслаўны Васкрасенскі сабор, і ўжо ў такім выглядзе яго нам паказваюць нешматлікія фатаздымкі [1].

Крыху інакш абстаяць справы з грэка-каталіцкім храмам Апекі Маці Божай ордэну базыліянаў. Хоць ён і быў перабудованы пад праваслаўную царкву ў 1831 г., але ж змены не былі вельмі радыкальнымі, таму да нас дайшлі яго фатаздымкі. На іх бачны велічны касцёл на стыку стыляў барока і ракако, уяўляў сабой кананічную крыжова-купальную трохнэфавую і двухвежавую базыліку. Ярусную кампазіцыю храма фарміравалі высокі цэнтральны і паніжаныя бакавыя нэфы. Фасад завяршаўся тэлескапічнымі бакавымі вежамі з фігурнымі купаламі-ківорыямі над верхнімі каркаснымі ярусамі, вуглавымівалютамі і фігурным франтонам паміж імі (такія ж над крыламі трансепта). У сяродкрыжжы ўзвышаўся гранёны светлавы барабан пад фігурным цыбулепадобным купалам, апяразаным шэрагам круглых люкарн (надбудаваны пры праваслаўных) [1]. У 1969 г. рэшткі храма былі зруйнаваныя, і ад базыліянскага кляштара ў спадчыну нам застаўся, здаецца, самы спрэчны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

архітэктурны аб'ект сучаснай Оршы – манастырскі будынак былога базыліянскага кляштара. Ён адзіны не змог знайсці сабе сучаснага прызначэння, знаходзіцца ў аварыйным стане, нават нягледзячы на тое, што даўно ўжо перададзены Свята-Пакроўскаму жаночаму манастыру. На ўласныя сілы манастыр займаецца справай аднаўлення, ужо гатовы праект рэстаўрацыі, справа толькі ў фінансаванні. Гэта здаецца амаль што нерэальным, але ж у 2007–2008 гг. у горадзе ўсё ж такі адбылася сапраўды добрая і якасная рэстаўрацыя – адбудавалі жылы корпус езуіцкага калегіума, які зараз з'яўляецца адной з візітных картак горада, а таксама дае надзею іншым былым кляштарным пабудовам на аднаўленне і далейшае жыццё.

Надзею на аднаўленне мае і сам па сабе Касцёл у Оршы. Пачынаючы з 1989 г., калі дамініканскі касцёл св. Юзафа аднавілі айцы-марыяне, аршанскія католікі маюць сваю парафію, якая пастаянна разрастаецца, а зусім нядаўна раздзялілася на дзве (другая святыня будуецца). Такім чынам, жыццё каталіцкіх кляштараў і Касцёла на тэрыторыі працягваецца, а пры тым, што гісторыя мае шмат белых плямаў, наша даследаванне будзе актуальным яшчэ доўгія гады. Паколькі інфармацыі вельмі шмат, і з кожным днём яе аб'ём павялічваецца, то нельга казаць пра завершанасць даследавання, і наш артыкул можна назваць справаздачай па вызначанай тэме. Такім чынам, на сёняшні момант прагледжаны даступныя літаратурныя крыніцы па разглядаемай тэме, праведзена работа ў Занальным архіве горада Орша, у Аршанскім музеі гісторыі і культуры і этнаграфічным музеі «Млын».

Як магчымы вынік праведзенай працы можна разглядаць стварэнне своеасаблівага даведніка на дадзеную тэму, які стаў бы не толькі важным гістарычным і культуралагічным зборнікам, але змог бы звярнуць увагу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыхароў горада да культурнай спадчыны сваёй малой радзімы.І гэта прынесла б вялікі плён.

---

1. Кулагін, А.М. Каталіцкія храмы Беларусі / А.М. Кулагін ; фатограф А.Л. Дыбоўскі. – Мінск, 2008. – С. 272–278.

2. Орша-город монастырей [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http ://ogog2.goroo-orsha.by/index.php?option=. – Дата доступа : 12.02.2016.

3. Памяць. Орша і Аршанскі раён: гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 2000. – Кн. 2. – С. 460–467.

4. Туронак, Ю. Фарміраванне сеткі рыма-каталіцкіх парафій на Беларусі ў 1387–1781 гадах / Ю. Туронак [Электронны рэсурс]. // Наша Вера. – Рэжым доступа : http://media.catholic.by/nv/n1/. –Дата доступа : 13.02.2016.

**Грыбко А.У.,** студ. 319 к гр.
Навуковы кіраўнік – Ражкова Л.Л.

## ВОПЫТ ДАСЛЕДВАННЯ ФАЛЬКЛОРНАЙ ПЕСЕННАЙ ТРАДЫЦЫІ ВЁСКІ РЭДЗЬКАЎШЧЫНА ПАСТАЎСКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

У сучасным свеце хуткімі тэмпамі расце працэс урбанізацыі. Вёскі з іх самабытнай песеннай культурай паступова знікаюць з аблічча роднага краю. Я даўно зацікавілася гісторыяй і фальклорам маёй малой радзімы – вёскі Рэдзькаўшчына, што ў Пастаўскім раёне. Старыя людзі адыходзяць, а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ